МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УА "БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ"

# ТРАДЫЦЫЙНАЕ ТКАЦТВА

Вучэбная праграма
для студэнтаў спецыяльнасці "Народная творчасць"
спецыялізацыі "Народныя рамествы"
(ФЗН)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск – 2012

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Прохарцава Т.А. – выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Шаура Р.Ф. - доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў .

Багданава Г.Б. – дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытікі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 11 ад 28.06.2012 );

Навукова метадычным саветам УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № ад )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

© Прохарцава Т.А., 2012

## Тэматычны план

*на 2012/2013 для 513, 513а гр.*

| № | Назвы тэм і раздзелаў | Лекцыі | Практычныя | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | **Раздзел №1**<br>**Традыцыйнае ткацтва ў кантэксце сучаснага ДПМ** | | | |
| Тэма 1 | Традыцыйныя ткацкія тэхнікі | 1 | 4 | 5 |
| Тэма 2 | Кампазіцыя ў ткацтве. Арнамент | 2 | 2 | 4 |
| Тэма 3 | Спалучэнне ткацтва з іншымі відамі ДПМ | 1 | 6 | 7 |
| | Усяго : | 4 | 12 | 16 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тлумачальная запіска.**

Вывучэнне прадмета «Традыцыйнае ткацтва» прадугледжвае чытанне лекцый, лабараторныя заняткі і самастойную працу. Курс прадмета адносіцца да спецыяльных дысцыплін і накіраваны на ўдасканаленне ведаў будучага спецыяліста ў галіне стварэння мастацкіх твораў. Асноўны змест курса складаюць практыкаванні, якія адлюстроўваюць уяўленне студента аб граматным кампазіцыйным рашэнні мастацкіх задач і аб стварэнні дэкаратыўных кампазіцый для сучаснага інтэр'ера.

Народнае мастацкае ткацтва – адзін з найбольш папулярных і пашыраных відаў народнага мастацтва. У матэрыяльнай культуры беларусаў яно займае адно з галоўных месцаў. Мы звыкла ацэньваем тканыя рэчы з пазіцыі прыгажосці, адмысловасці арнаментыкі, гармоніі каларыту. Але народнае ткацтва – яшчэ і бяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак.У выніку сінкрэтычнага развіцця народнай культуры ў традыцыйных тканінах перапляліся матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці беларускага селяніна. увесь працэс вырабу тканіны – ад пасеву лёну да самога ткацтва, – арганічна ўваходзіў у сетку народнага календара, па якому вызначаліся пачатак і канец усялякай земляробчай працы, дні святаў, прысвяткаў і пастоў, а тканыя рэчы – паясы, рушнікі, абрусы, наміткі ўдзельнічалі ў разнастайных дзействах, звязаных з сямейнымі і рэлігійнымі абрадамі, рознымі павер'ямі.

*Мэта* курса – фарміраванне спецыяліста дэкаратыўна-прыкладного мастацтва, які валодае наватарскімі і традыцыйнымі метадамі стварэння твораў ДПМ.

*Задачы* курса:

- пазнаёміць з гісторыяй беларускага народнага ткацтва;
- атрымаць веды па сімволіцы народнага ткацтва;
- навучыць наватарскім і традыцыйным спосабам кампазіцыі ў тканых вырабах, і спалучэння іх з іншымі відамі ДПМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку вывучэння дысцыпліны «Канструяванне ў ДПМ» студент павінен ведаць:

- Асноўныя панянці і значэнні;
- спеціфіку і асаблівасці традыцыйнага ткацтва;
- выразныя сродкі тэкстыльнай кампазіцыі.

Курс «Традыцыйнае ткацтва» падзяляецца на тэарэтычную і практычную часткі. Курс прадмета разглядае мастацкую арганізацыю тканіны і выразныя сродкі кампазіцыі ў ткацтве, а таксама спалучэнне традыцыйнага ткацтва з іншымі відамі ДПМ.

Прадмет разглядае асноўныя прынцыпы стварэння мастацкага твора ў ДПМ (на прыкладзе ткацтва). Студэнты навучаюцца мастацкай вобразнай сістэме. Аўдыторныя і хатнія заданні выконваюцца свабодным стылем, выніковыя эскізы і малюнкі выконваюцца колерам (паліхромныя). Праверка практычных заданняў ажыццяўляецца па прапрацаванаму матэрыялу і па засвоенай тэрміналогіі, прыменяемай у практыцы. Для замацавання матэрыялу студэнты павінны выконваць самастойныя і хатнія заданні, якія складаюцца з замалёвак і выканання ў матэрыяле разнастайных кампазіцый. У працэсе навучання адбываюцца прагляды практычных заданняў, у час якіх вызначаецца ступень засвоеннасці матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Раздзел №1 Традыцыйнае ткацтва ў кантэксце сучаснага ДПМ

Раздзел складаецца з трох тэм: традыцыйныя ткацкія тэхнікі; кампазіцыя ў ткацтве, арнамент; спалучэнне ткацтва з іншымі відамі ДПМ. Студэнты павінны ўдасканаліць веды па основах кампазіцыі ў ДПМ на прыкладже народнага і прафесійнага ткацтва, а таксама іх узаемазвязі. Студэнты павінны вывучыць мастацкія сродкі ткацкай кампазіцыі: метр і рытм, сіметрыя і асіметрыя, дынаміка і статыка. Раздзел уключае ў сабе вывучэнне мастацкага аздаблення тканіны.

#### *Тэма 1. “Традыцыйныя ткацкія тэхнікі”*

Вывучэнне розных ткацкіх тэхнік (двух-, чатырох, -пяці, шасці-, васьмінітовае, выбарнае, закладное, ажурнае ткацтва), відаў тканін (падвоеныя, двухуточныя, тканіны саржавых перапляценняў, “дымкі” і г.д). тканіны з фактурным ажурападобным перапляценнем. Арнаментальныя матывы нітовых тканін.

**Студэнтам прапаноўваецца** намаляваць эскізы для вырабу тканін рознымі тэхнікамі, стварыць эскізы кампазіцыі паводле арнаментальных матываў нітовых тканін.

#### *Тэма 2. “Кампазіцыя ў ткацтве. Арнамент”*

Мастацкае аздабленне тканіны, кампазіцыйныя асаблівасці і сродкі гарманізацыі ў традыцыйным і сучасным ткацтве, прапорцыі і рытм. Геаіетрычны, раслінны, зоаморфны арнаменты. Вобразы ўраджаю і ўрадлівасці. Вобразы маці, святаў, кветак, кахання. Хрысціянская сімволіка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Студэнтам прапаноўваецца** намаляваць эскізы тканых кампазіцый на розныя тэматыкі: народныя святы, абрады, традыцыйная сімволіка. Стварыць эскізы кампазіцыі паводле традыцыйных арнаментальных матываў.

*Тэма 3 "Спалучэнне ткацтва з іншымі відамі ДПМ"*

Сучаснае мастацкае ткацтва і традыцыйнае народнае. Спалучэнне розных тэхнік і матэрыялаў. Творы ДПМ у інтэр'еры. Стварэнне розных дэкаратыўных кампазіцый і асобных твораў шляхам спалучэння традыцыйнага ткацтва з іншымі відамі ДПМ. Студэнты павінны стварыць шэраг эскізаў і макетаў, а таксама вырабы ў матэрыяле.

**Студэнтам прапаноўваецца** намаляваць эскізы дэкаратыўных кампазіцый на заданую і свабодную тэму, стварыць кампазіцыі ў матэрыяле.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура


1. *Курилович А. Н.* Белорусское народное ткачество — Мінск: Наука и техника, 1981. — 119 с.
2. *Поболь Л. Д.* Славянские древности Белоруссии — Мінск, 1971.
3. *Воронин Н. Н.* Древнее Гродно // Материалы и исследования по археологии древнерусских городов — М., 1954 Т. 3.
4. *Лебедева Н. И.* Прядение и ткачество восточных славян в XIX - начале XX в. // Восточнославянский этнографический сборник — М., 1953. — С. 493..
5. *Селівончык Вера* Ткацтва на дошчачках. Практычны дапаможнік(Майстроўня). — Мінск: Медысонт, 2009. — 64 с.
6. Кацар М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка/ Навук. рэд. Я.М.Сахута. - Мн.: БелЭн, 1996 - 208 с.
7. http://uzor.iatp.by/html/structure.html
8. http://www.jivebelarus.net/our-heritage/Byelorussian-national-dress.html?page=3


**Дадатковая літаратура:** метадычныя і наглядныя дапаможнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ